# Выступленне Г. С. ТАРАЗЕВІЧА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).

самі кіруем. Вядома, што ў гандлі дэфіцыт швейных вырабаў. А вось у гарадскім пасёлку Ушачы швейны цэх шые рукавіцы і спецадзенне для аграпрома. Слоў няма, патрэбна і спецадзенне. Але пашыць яго можна было б зімой, у вёсках, сіламі падсобных промыслаў, а швейны цэх мясцпрома пераарыентаваць на пашыў адзення для гандлю.

Там жа, ва Ушачах, ёсць і яшчэ адзін цэх — дрэваапрацоўчы. Вырабляе розныя скрынкі, шафкі па заказах прадпрыемстваў. Добрыя шафкі. Значыць, і спецыялісты там добрыя, якія маглі б рабіць і дабротную мэблю для сельскага жыхара, якой, дарэчы, я не бачыў ні ў адным магазіне. Значыць, трэба зноў-такі пераарыентаваць цэх. Такое ж становішча і ў Ветрыне ды і ў многіх іншых вытворчасцях мясцовай прамысловасці. Мы, канечне, будзем разбірацца з міністэрствам, з іншымі рэспубліканскімі органамі. Аднак маглі б навесці парадак тут і раённыя, і абласныя кіраўнікі, калі б па-сапраўднаму ўзяліся.

Або ўзяць Наваполацк. Стотысячны маладзежны горад. І няма ніводнага прадпрыемства мясцовай прамысловасці. А кааперацыя? Усё, што створана, арыентуецца ў асноўным на заказы дзяржаўных прадпрыемстваў, а не насельніцтва. Кааператыўных тавараў народнага спажывання выраблі там у гэтым годзе ўсяго на 37 тысяч рублёў.

Такім чынам, ясна: не займаемся мы таварамі як след. А абстаноўка патрабуе неадкладных мер. Неабходна ўсімі сіламі нарошчваць вытворчасць тавараў і паслуг. Трэба арыентавацца на самазабеспячэнне, выкарыстоўваць для гэтага ўсе наяўныя рэсурсы і магчымасці. І гэта — першарадная справа мясцовых Саветаў, усіх дэпутатаў.

Таварышы! Выступаючы сёння перад вамі, я па абавязку службы галоўным чынам гаварыў аб недахопах у рабоце Саветаў. Ды і не толькі па абавязку службы. Бо перабудова, палітычная рэформа карэнным чынам мяняюць работу Саветаў. І без належнай дапамогі партыйных арганізацый, партыйных камітэтаў зрабіць гэта проста немагчыма. Сур'ёзнай увагі, на маю думку, заслугоўвае праблема стабілізацыі кіруючых кадраў савецкіх органаў. Толькі ў 1987 годзе, напрыклад, змянілася 11 з 29 старшынь райгарвыканкомаў, а сёлета — яшчэ 9.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі